ношений. – 2002. – № 3. – С. 37–45; Ціхаміраў, А.В. Беларусь у сістэме міжнародных адносін перыяду пасляваеннага ўладкавання Еўропы і польска-савецкай вайны (1918–1921 гг.) / А.В. Ціхаміраў. – Мн. : Экаперспектыва, 2003. – 399 с.
26. Цобкала, А. Нацыянальны рух у гады Першай сусветнай вайны (1915 – пачатак 1917) / А. Цобкала // Пытанні гісторыі і методыкі выкладання. Зб. навуковых арт. – Мн., 1998. – Вып. 1. – С. 98–104.
27. Цуба, М.В. Нацыянальна-культурная і дабрачынная дзейнасць Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны (1915–1917 гг.) / М.В. Цуба // Вестник Полесского государственного университета. Серия общественных и гуманитарных наук. – 2012. – № 2. – С. 21–30; Цуба, М.В. Першая сусветная вайна на Беларусі ў кантэксце сусветных ваенных падзей (грамадскі і ваенны бакі) 1914–1918 гг. / М.В. Цуба. – Пінск : ПалесДУ, 2010. – 303 с.
28. Хомич, С.Н. Территория и государственные границы Беларуси в ХХ веке: от незавершённой этнической самоиндентификации и внешнеполитическогопроизвола к современному status quo / С.Н. Хомич. – Мн. : Экономпресс, 2011. – 415 с.
29. Чарнякевіч, А. Сярэдняя Літва / А. Чарнякевіч // Беларуская энцыклапедыя. – Мн., 2002. – Т. 15. – С. 362–363.
30. Щавлинский, Н.Б. Белоруское национальное движение в годы Первой мировой войны / Н.Б. Щавлинский. – Мн. : РИВШ, 2001. – 136 с.; Щавлинский, Н.Б. Белоруское национальное движение в годы Первой мировой войны (1914–1918 гг.) : автореф. дис. на соиск. учен. степ. канд. ист. наук: 07.00.02 / Н.Б. Щавлинский. – Мн, 2000. – 21 с.

## ЗАХАВАННЕ ТРОХ ПАЎНОЧНЫХ ПАВЕТАЎ ВІЦЕБСКАЙ ГУБЕРНІ Ў СКЛАДЗЕ РСФСР У 1924 г.

***А.В. Бараноўскі (Мінск)***

Віцебкая губерня з’яўлялася месцам кампактнага пражывання беларускага насельніцтва. У студзені 1919 г. Віцебшчына ўваходзіла ў склад ССРБ. Аднак неспрыяльныя знешнепалітычныя абставіны і прычыны эканамічнага характару прывялі да передачы губерні ў склад РСФСР. Пасля перадачы і да прыняцця рашэння аб ўз’яднанні тэрыторыі Віцебскай губерні з БССР, кіраўніцтва Беларускай рэспублікі і мясцовая грамадскасць ставіла перад партыйнымі і савецкімі органамі СССР і РСФСР пытанне аб вяртанні ўсходнебеларускіх тэрыторый. Напрыканцы 1923 г. быў прыняты шэраг рашэнняў аб перадачы тэрыторыі Віцебскай губерні ў склад БССР.

Палітбюро ЦК РКП(б) 29 лістапада 1923 г. на сваім пасяджэнні зацвердзіла прапанову камісіі Аргбюро ЦК РКП(б) аб змене межаў Беларускай рэспублікі. Згодна з ёй, тэрыторыя Віцебскай губерні цалкам вярталася ў склад БССР. Прэзідыуму ЦВК СССР было прапанавана ў месячны тэрмін адпаведна аформіць пастанову Палітбюро ЦК РКП(б), удакладніўшы межы БССР [1].

На пасяджэнні Прэзідыума ЦВК СССР 7 снежня 1923 г была створана камісія па змене межаў паміж РСФСР і БССР. У яе склад увайшлі: ад РСФСР – Ц. Сапронаў і А. Смірноў, ад БССР – В. Багуцкі і М. Мароз, ад УССР – Ф. Кон. Старшынёй камісіі быў прызначаны А. Енукідзэ [2].



Репозиторий ВГУ

18 снежня камісія, нягледзячы на пратэст прадстаўнікоў Беларускай рэспублікі, на сваім пасяджэнні пераглядзела рашэнне Палітбюро ЦК РКП(б) ад 29 лістапада 1923 г. і вырашыла пакінуць у складзе РСФСР Веліжскі, Невельскі і Себежскі паветы [3, арк. 96–98]. Гэта аргументавалася тым, што, згодна даным Усерасійскага дэмаграфічнага перапіса насельніцтва 1920 г., беларусы ў трох паўночных паветах Віцебскай губерні складалі меншасць (не больш за 35%). Даныя ўсеагульнага перапісу насельніцтва Расійскай імперыі 1897 г., на выкарыстанні якіх настойваў беларускі бок, не былі прынятыя да ўвагі.

Перапіс 1920 г. праходзіў у складаных знешнепалітычных абставінах. Падчас яго правядзення РСФСР і Польская Рэспубліка вялі перамовы аб міры. Сярод насельніцтва распаўсюджваліся чуткі аб плебісцыце і магчымым далучэнні тэрыторый з пераважна беларускім насельніцтвам да Польшчы. У гэтай сувязі шмат хто з беларусаў наўмысна адносіў сябе да рускай нацыі. Параўнанне даных перапіса 1897 г. і 1920 г. па Віцебскай губерні паказала змяншэнне колькасці беларускага насельніцтва цалкам па ўсёй губерні (з 75% да 56%), пры гэтым колькасць беларусаў у Веліжскім павеце скарацілася на 53% (з 87% да 34%), у Невельскім павеце на 53% (з 84% да 31%), у Себежскім павеце на 16 % (з 47% да 31%). Прымаючы рашэнні аб захаванні паўночных паветаў Віцебскай губерні ў складзе РСФСР толькі на падставе даных перапісу 1920 г., камісія ЦВК СССР ігнаравала дадзеныя этнаграфічных і лінгвістычных даследаванняў аб перавазе беларускага насельніцтва ў гэтых паветах.

Старшыня ЦВК і СНК БССР А. Чарвякоў выступіў супраць рашэння камісіі ЦВК СССР. 18 снежня 1924 г. ім была накіравана дакладная запіска ў ЦК РКП(б), у якой ён звяртаў увагу ЦК на тое, што дадзеная камісія мусіла заняцца ўсталяваннем дакладных межаў паміж РСФСР і тымі паветамі, што адыходзялі да Беларускай рэспублікі. Аднак замест гэтага камісія, нягледзячы на пратэст прадстаўнікоў Беларусі, падвергла другаснаму абмеркаванню пытанне аб паветах і прыняла шэраг рашэнняў, якія супярэчаць пастанове Палітбюро ЦК РКП(б) [3, арк. 99–101]. Так, па рашэнні большасці камісіі (3 супраць 2) тры паўночныя паветы Віцебскай губерні не перадаваліся БССР.

Старшыня камісіі ЦВК СССР па змене межаў паміж РСФСР і БССР А. Енукідзэ 19 снежня 1923 г. накіраваў ліст у Палітбюро ЦК РКП(б), у якім паведаміў пра пратэст прадстаўнікоў БССР супраць пакідання ў складзе РСФСР Веліжскага, Невельскага і Себежскага паветаў Віцебскай губерні. Прыняцце дадзенага рашэння ён тлумачыў дзвюма падставамі: па-першае, беларускае насельніцтва ў гэтых паветах у сярэднім не перавышае 33%, па-другое эканамічна гэтыя паветы імкнуцца да Пскоўскай губерні [4]. Для больш падрабязных тлумачэнняў па гэтым пытанні А. Енукідзэ прасіў выклікаць яго ў Палітбюро ЦК РКП(б).



Репозиторий ВГУ

На пасяджэнні Палітбюро ЦК РКП(б) 29 снежня 1923 г. былі разгледжаны вынікі работы камісіі ЦВК СССР па змене межаў паміж РСФСР і БССР, а таксама пратэст кіраўніцтва апошняй, на падставе чаго была прынята пастанова: «Кіруючыся этнаграфічным прынцыпам, далучыцца да меркавання большасці камісіі па пытанні аб далучэнні да Беларусі <…> 3-х паветаў Віцебскай губерні» [5]. Такім чынам, Віцебская губерня за выключэннем Веліжскага, Невельскага і Себежскага паветаў вярталася ў склад БССР.

Рашэнне аб уз'яднанні часткі тэрыторыі Віцебскай губерні з БССР было зацверджана 4 лютага 1924 г. на пасяджэнні Прэзідыума УЦВК [6, арк. 106]. У гэты ж дзень адбылося пасяджэнне Палітбюро ЦК РКП(б), на якім была прынята пастанова: «Перадаць на разгляд камісіі ЦВК СССР па вызначэнні межаў Беларусі пытанне аб далучэнні да ўзбуйненай Беларусі трох паўночных паветаў Віцебскай губерні» [6].

Прэзідыум УЦВК 13 лютага 1924 г. разглядзеў пытанне аб перадачы БССР часткі тэрыторыі РСФСР. У выніку, хадайніцтва ЦВК БССР аб перадачы Беларускай рэспубліцы Веліжскага, Невельскага і Себежскага паветаў Віцебскай губерні было адхілена [7].

Прэзідыум ЦВК СССР на сваім пасяджэнні 22 лютага 1924 г. разглядзеў пытанне аб перадачы часткі тэрыторыі РСФСР у склад БССР. У выніку была прынята пастанова: «Прапанаваць Прэзідыуму УЦВК у 2-тыднёвы тэрмін другасна разглядзець пытанне аб перадачы 3-х паветаў Віцебскай губерні ў склад Беларускай ССР з выклікам зацікаўленых бакоў» [8, арк. 156].

Прэзідыум УЦВК 3 сакавіка 1924 г. у чарговы раз разглядзеў пытанне аб далейшым лёсе Веліжскага, Невельскага і Себежскага паветаў Віцебскай губерні і ўсё роўна пастанавіў пакінуць у сіле пастанову Прэзідыума УЦВК ад 13 лютага аб захаванні трох паўночных паветаў Віцебскай губерні у складзе РСФСР. У гэты ж дзень была апублікавана пастанова Прэзідыума УЦВК «Аб перадачы Беларусі раёнаў з пераважна беларускім насельніцтвам». Згодна з ёй Аршанскі, Віцебскі, Гарадоцкі, Дрысенскі, Лепельскі, Полацкі, Сенненскі і Суражскі паветы Віцебскай губерні (па старым адміністрацыйным дзяленні) вярталіся ў склад Беларускай рэспублікі [9].

Прэзідыум ЦВК СССР 7 сакавіка 1924 г. прыняў пастанову «Аб аб'яднанні ў складзе Беларускай ССР усіх тэрыторый Савецкага Саюза з большасцю беларускага насельніцтва» [10, с. 271–272]. Уз'яднанне ўсходнебеларускіх тэрыторыў з Беларускай рэспублікай лічылася Прэзідыумам ЦВК СССР «…найвялікшым актам узаемнага даверу народаў, якія насяляюць Саюз» [11]. Пастанова Прэзідыума ЦВК СССР была замацаваная VI Надзвычайным Усебеларускім з'ездам Саветаў, які праходзіў у Мінску з 13 па 16 сакавіка 1924 г. [10, с. 271–272].

Прэзідыум УЦВК 24 сакавіка 1924 г. вызначыў адміністрацыйна-тэрытарыяльную прыналежнасць Веліжскага, Невельскага і Себежскага паветаў у складзе РСФСР, пастанавіўшы іх далучыць да Пскоўскай губерні



Репозиторий ВГУ

[12]. Гэта пастанова была прадбачнай, паколькі тры паўночныя паветы Віцебскай губерні межавалі з Апочацкім, Вялікалуцкім і Таропецкім паветамі Пскоўскай губерні.

Прыняцце канчатковага рашэння аб захаванні Веліжскага, Невельскага і Себежскага паветаў у складзе РСФСР тлумачыцца збегам рознага роду абставінаў. Кіраўніцтва Віцебскага губкама РКП(б) і губвыканкама паслядоўна і мэтанакіравана выступала супраць уз'яднання з Беларуссю на працягу 1919–1923 гг. У ЦК РКП(б) з губернскага цэнтру накіроўваліся шматлікія дакладныя запіскі, у якіх адзначалася, што беларусы ў Віцебскай губерні складаюць меншасць, імкненне да Беларусі не назіраецца, а таму няма ніякіх падстаў для ўз'яднання з БССР [13].

Менавіта адмоўным стаўленнем губернскіх уладаў да вяртання ў склад Беларускай рэспублікі скарысталіся ў сваіх мэтах члены камісіі ЦВК СССР па змене межаў паміж РСФСР і БССР з расійскага боку. Так, наркам земляробства РСФСР А. Смірноў выступаў супраць выдзялення са складу РСФСР любых тэрыторый, незалежна ад таго, куды яны будуць перададзеныя [10, с. 233]. Сакратар УЦВК, старшыня камісіі па раянаванню РСФСР Ц. Сапронаў наогул з'яўляўся адным з лідэраў апазіцыі да ЦК РКП(б). Ён заяўляў, што ігнараванне пазіцыі губернскіх улад Віцебшчыны па дадзеным пытанні падрывае існаванне дэмакратызму ва ўсёй РКП(б) [10, с. 233].

Такім чынам, Веліжскі, Невельскі і Себежскі паветы не мелі ніякага стратэгічнага значэння для РСФСР. Адмова ў іх вяртанні ў склад БССР тлумачылася збегам абставін. Дзеля пазбягання складанай палітычнай сітуацыі і абвінавачванняў партыі ў манапалізацыі ўлады, а таксама для спынення ўнутрыпартыйнай дыскусіі, ЦК РКП(б) пагадзіўся пераглядзець свае ранейшыя рашэнні адносна передачы ўсёй тэрыторыі Віцебскай губерні ў склад Беларускай рэспублікі.

*Крыніцы і літаратура:*


1. РДАСПГ. – Ф. 17. Воп. 3. Спр. 397. Арк. 10.
2. ДАРФ. – Ф. 3316. Воп. 16. Спр. 186. Арк. 4.
3. НАРБ. – Ф. 1440. Воп. 3. Спр. 478.
4. ДАРФ. – Ф. 3316. Воп. 64. Спр. 2. Арк. 2.
5. РДАСПГ. – Ф. 17. Воп. 3. Спр. 406. Арк. 2.
6. РДАСПГ. – Ф. 17. Воп. 3. Спр. 414. Арк. 6.
7. ДАРФ. – Ф. 3316. Воп. 16. Спр. 206. Арк. 117.
8. НАРБ. – Ф. 6. Воп. 1. Спр. 346.
9. О передаче Белоруссии районов с преобладающим белорусским населением: Декрет ВЦИК, 3 марта 1924 г. // Собрание узаконений и распоряжений рабочего и крестьянского правительства РСФСР. – 1924. – № 24. – Ст. 237.
10. Государственные границы Беларуси : сб. документов и материалов : в 2 т. / сост. : В. Е. Снапковский [и др.]. – Минск : БГУ, 2012–2013. – Т. 1 : (март 1917 – ноябрь 1926), 2012. – 495 с.
11. Обращение президиума ЦИК СССР // Известия ЦИК СССР и ВЦИК Советов – 1924. – 9 мар. – С. 3.




Репозиторий ВГУ

12. О дополнении к постановлению о передаче Белоруссии районов с преобладающим белорусским населением: Декрет ВЦИК, 24 марта 1924 г. // Собрание узаконений и распоряжений рабочего и крестьянского правительства РСФСР. – 1924. – № 39. – Ст. 357.
13. Бараноўскі, А. Пазіцыя губернскіх улад адносна змянення адміністрацыйна-тэрытарыяльнай прыналежнасці Віцебскай губерні ў 1919–1924 гадах / А. Бараноўскі // Беларуская думка. – 2019. – № 7. – С. 57–63.

## КУЛЬТУРНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ З САВЕТАМ ЕЎРОПЫ

***Дз.А. Крывашэй (Мінск)***

Адным з напрамкаў міжнароднага супрацоўніцтва Рэспублікі беларусь з'яўляецца ўдзел у міжнародных арганізацыях. Адной з іх з'яўляецца Савет Еўропы. Пачынаючы з 16 верасня 1992 г. Рэспубліка Беларусь мела статус «спецыяльна запрошанай» дзяржавы ў рамках дзейнасці Парламенцкай Асамблеі Савета Еўропы (ПАСЕ), а 12 сакавіка 1993 г. падала заяўку на ўступленне Савет Еўропы.

У кастрычніку 1993 г. Беларусь далучылася да Еўрапейскай культурнай канвенцыі, што дазволіла атрымаць доступ да праграм еўрапейскага супрацоўніцтва ў галіне культуры, адукацыі, спорту, СМІ і інш. [6, с. 48] А ў 1996 г. наша краіна стала ўдзельніцай Еўрапейскай Канвенцыі па ахове археалагічнай спадчыны [1].

Пачатак супрацоўніцтва з Саветам Еўропы вызначаўся значнай актыўнасцю. У першую чаргу спецыялісты з Беларусі атрымалі магчымасць азнаёміцца з вопытам сваіх еўрапейскіх калег шляхам стажыровак, кансультацый, удзелу ў міжнародных семінараў, канферэнцыях і г.д. За няпоўныя 5 гадоў (верасень 1992 г. – снежань 1996 г.) гэтай магчымасцю скарысталася больш за 300 прадстаўнікоў разнастайных галін улады Беларусі (сярод іх і прадстаўнікі ўстаноў культуры) [5, с. 167–168].

Пры падтрымцы Савета Еўропы быў праведзены шэраг мерапрыемстваў у Бларусі. Найбольшую цікаўнасць выклікаў міжнародны семінар-прадстаўленне праграмы «Культурныя шляхі праз Беларусь» з удзелам кіраўніка праграмы Савета Еўропы Д. Ранконі (верасень 1995 г., г. Полацк), арганізаваны Міністэрствам культуры і друку Рэспублікі Беларусь, Саветам культурных ініцыятыў і Полацкім гарвыканкамам [5, с. 168].

У наступныя гады адбылося згортванне палітычных кантактаў. У студзені 1997 г. Бюро ПАСЕ прыняло рашэнне аб прыпыненні статусу «спецыяльна запрошанага» ў адносінах да парламента Беларусі. У выніку быў таксама спынены разгляд заяўкі Рэспублікі Беларусь на ўступленне ў Савет Еўропы і замарожана двухбаковая праграма супрацоўніцтва. У такой сітуацыі ўзаемадзеянне з Саветам Еўропы працягвала развівацца ў рамках



Репозиторий ВГУ